5. Российский государственный исторический архив в Санкт-Петербурге. – Фонд 1267. – Оп. 1. – Д. 12. Журнал Западного комитета за 1862 г.
6. Середонин, С.М. Исторический обзор деятельности комитета министров: в 2 т. / С.М. Середонин. – СПб.: изд. канцелярии Комитета министров, 1902 – Т. 2. – Ч . 1. – 373 с.

## ДЗЕЦІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Лойка Т.В.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Гісторыя Беларусі пранізана войнамі. Яны пракатваліся па нашай зямлі з захаду на ўсход і з поўначы на поўдзень. Наступствы войнаў заўседы былі вялікімі, а часам жудаснымі. Разбуралася гаспадарка, руйнаваліся гарады, гінулі людзі. Але беларускі народ, цярплівы і працалюбівы, неверагоднымі намаганнямі, гераічнай працай адраджаў разбуранае і жыцце працягвалася.

Вялікая Айчынная вайна 1941-1945 гг. па сваёй трагічнасці адна з самых жорсткіх. Яна каштавала Беларусі паловы нацыянальнага багацця, трэцяй часткі насельніцтва, што складала каля трох мільёнаў чалавек. Лічыцца, што вайна пачалася раптоўна. Але і сёння нельга не задумвацца і не шукаць праўдзівы адказ на пытанне, чаму тагачаснае палітычнае кіраўніцтва не змагло абараніць насельніцтва ад яе цяжкіх наступстваў. Вайна ўварвалася ў кожны дом, у кожную сям’ю, разарвала жыцце людзей на дзве часткі – да і пасля вайны.

Адным з самых драматычных наступстваў Вялікай Айчыннай вайны быў лёс дзяцей, якія сталі “малымі заложнікамі вялікай вайны”. На Беларусі ў перадваенны перыяд дзеці да 16 гадоў складалі 4,3 млн. человек. Ім дасталося шмат пакут, у іх было ўкрадзена дзяцінства. Гэтай вострой праблеме ваеннага перыяду прысвечана нямала ўспамінаў, навуковых артыкулаў, дысертацый і манаграфій, якія ўтрымліваюць вялікі факталагічны матэрыял. Аднак, на наш погляд, ей зусім недастаткова адводзіцца месца ў

выхаваўчай рабоце. Між тым, менавіта гэта тэма здольна ўзрушыць пачуцці, выклікаць спачуванне і застацца ў памяці назаўсёды.

Першым крокам выратавання дзяцей ад жахаў вайны была эвакуацыя на ўсход. Ужо 25 červеня 1941 г. была створана рэспубліканская эвакуацыйная камісія, якая займалася гэтай справай. Вядома, што на ўсход, за Урал, у Паволжа і іншыя рэгіёны з Беларусі было эвакуіравана каля 1,5 млн. чаловек [1, с. 403]. У першую чаргу эвакуіраваліся дзеці. Агульнымі намаганнямі ўладаў і кіраўнікоў дзіцячых устаноў ужо ў першы тыдзень вайны было вывезена 110 дзіцячых дамоў, 50 дзіцячых садкоў, 28 піянерскіх лагераў, 6 спецшкол і дзіцячых санаторыяў, дзе знаходзілася 16,7 тыс. дзетак [2, с. 7]. Яшчэ каля 500 тыс. дзяцей выехала ў тыл разам з дарослымі. Эвакуацыя адбывалася ў складаных, экстрэмальных умовах, пад інтэнсіўнымі бамбардзіроўкамі ворага. Адзін з выхаванцаў Віцебскага дзіцячага дома ўспамінаў: “Бомба трапіла ў вагон з хлопчыкамі, каля 40 дзяцей загінулі…” [3, с. 27].

Трэба адзначыць, што эвакуацыя дзяцей працягвалася і пазней, калі тэрыторыя Беларусі была ўжо акупіравана. Так, у гісторыі засталася гераічная аперацыя беларускіх партызан атрада імя Шчорса пад назвай “Зорачка”. У лютым 1944 г. яны эвакуіравалі з акупіраванай тэрыторыі на Вялікую зямлю каля 200 выхаванцаў Полацкага дзіцячага дома № 3 [2, с. 343]. Аднак такія акцыі не набылі масавага характару, бо магчымасці былі абмежаваныя. Усяго па дадзеных ЦШПР у савецкі тыл было вывезена каля 5 тыс. жанчын, дзяцей і старых. Агульная колькасць эвакуіраваных на ўсход дзяцей склала толькі 14-15 %. Каля 85% дзяцей, а гэта 3.7 млн., засталіся на акупіраванай тэрыторыі і вымушаны былі пераносіць усе цяжкасці акупацыйнага рэжыму. Іх лёсам стала барацьба, перш за ўсё, барацьба за выжыванне [4, с. 79].

Шмат дзяцей, што страцілі бацькоў і сем’і ў першыя месяцы вайны, ператварыліся ў бадзяг і папрашаек. У іх ваенным дзяцінстве панавалі голад, холад, хваробы, беспрытульнасць і жабрацтва. Нямецкія акупацыйныя ўлады не цікавіліся такімі дзецьмі, бо іх трэба было ўтрымліваць і забяспечваць. Смяротнасць сярод іх была высокая. Досыць часта акупанты праводзілі бесчалавечныя акцыі па зачыстцы тэрыторыі ад такіх дзяцей. Так, у верасні 1942 г. каля мінскага вакзала было растраляна амаль 100 бяздомных дзяцей ва ўзросце ад 5 да 12 гадоў [5, с. 95].

Разам з тым, на акупіраванай тэрыторыі засталося шмат дзіцячых устаноў, якія не паспелі эвакуіравацца. У Віцебску, напрыклад, дзейнічалі 5 дзіцячых дамоў, у Сенненскім раёне – 2, у Аршанскім – 4 і г.д. Жыццё дзяцей у гэтых установах таксама было на мяжы выжывання. Акупанты выкарыстоўвалі іх на цяжкіх работах, рабілі донарамі для забора крыві для нямецкіх салдат, а часта проста знішчалі. Памяць людская захавала адзін са шматлікіх трагічных эпізодаў вайны – знішчэнне ў верасні 1942 г. дзяцей Дамачоўскага дзіцячага дома на Брэсчыне. 54 дзіцяці ва ўзросце ад 5 да 13 гадоў разам з выхавацелямі былі растраляны недалёка ад станцыі Дубіца. Гэта былі дзеці афіцэраў Чырвоный арміі [6, с. 165].

З разгортваннем масавага руху супраціўлення акупанты ўзмацнілі рэпрэсіі і тэрор супраць мірнага насельніцтва, спрабуючы задушыць імкненне беларускага народа да вызвалення. На тэрыторыі Беларусі яны правялі 140 карных аперацый, спалілі 9200 вёсак, з іх 628 разам з жыхарамі. Незабываемым болем адзываецца ў кожнага звон калакалоў Хатыні, дзе зажыва было спалена 149 чалавек, 76 з якіх – дзеці. Не сакрэт, што досыць часта ворагі выкарыстоўвалі мясцовых жыхароў, у тым ліку і дзяцей, для размініравання тэрыторый, для прыкрыцця наступальных дзеянняў сваіх салдат. Так, у канцы жніўня 1941 г. нямецкія салдаты пад прыкрыццём малалетніх дзяцей, старых і жанчын захапілі пераправу на рацэ Іпуць каля Добуша [7, с. 177].

Але самыя абяздоленыя дзеці вайны – гэта малалетнія вязні фашысцкіх лагераў і гета. У іх адабралі не толькі хлеб, дом, мацярынскую ласку, у іх адабралі радзіму і свабоду. Як вядома, на Беларусі фашысты стварылі 260 канцлагераў і іх філіялаў, дзе былі нечалавечыя ўмовы існавання. Большасць малалетніх вязняў былі бязвінныя яўрэйскія дзеці. Людзі, рызыкуючы жыццём, хавалі ў сваіх дамах такіх дзетак, давалі ім іншыя імёны, дзяліліся апошнім кавалкам хлеба. Тым не менш, ахвярамі халакоста на Беларусі сталі амаль 800 тыс. чалавек, сярод якіх значная колькасць дзяцей. Тыя, каму давялося выжыць, з жахам успамінаюць сваё дзяцінства. У Віцебску былыя вязні фашызму стварылі асацыяцыю “Лёс”. Яны выступаюць перад моладдзю, удзельнічаюць у правядзенні тэматычных экскурсій, урокаў мужнасці, лінеек памяці. У 1988 г. створана і дзейнічае на постсавецкай прасторы грамадскае аб’яднанне малалетніх вязняў нацызму. 11 красавіка па рашэнню

ААН адзначаецца Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў.

Па няпоўных падліках, у выніку генацыду на тэрыторыі Беларусі за 1941–1944 гг. загінула больш за 166 тыс. непаўналетніх, а сіротамі засталіся больш за 138 тыс. дзяцей [4, с. 107].

Але не толькі масавы генацыд выкарыстоўвалі гітлераўцы, каб паставіць на калені насельніцтва Беларусі. Не менш важную стаўку яны рабілі на так званую германізацыю (анямечванне) пэўнай часткі беларусаў. Яны спрабавалі адабраць найбольш прыгодную, на іх думку, у расавых адносінах частку моладзі і ўсімі магчымымі сродкамі – прапагандай, дэмагогіяй, хлуснёй навязаць ім нацысцкую ідэалогію. Гэтай мэце павінна была служыць сістэма дашкольнага выхавання і школьнай адукацыі, створанная на акупіраванай тэрыторыі. Па меркаванню акупацыйных улад, яе задачай была падрыхтоўка паслухмяных, пранікнутых ідэямі нацыянал-сацыялізму працалюбівых падлеткаў, якія б аддавалі ўсе сілы “Вялікай Германіі”.

Ужо з вясны 1943 г. акупацыйныя ўлады пачалі праводзіць мэтанакіраваны вываз беларускай моладзі, у тым ліку і дзяцей старэйшага школьнага ўзросту, на прымусовыя работы ў Германію. Прымусовыя дэпартацыі ставілі задачу, разам з вытворчымі, анямечвання пэўнай часткі насельніцтва Беларусі. Як вядома, за гады вайны з тэрыторыі Беларусі было вывезена каля 380 тыс. чалавек, сярод якіх больш за 33 тыс. непаўналетніх дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў [4, с. 58]. Дзеці адрываліся ад сям’і, ад роднай зямлі, адчувалі на сабе моцнае псіхалагічнае ўздзеянне германскай прапаганды пра непазбежнасць перамогі Германіі ў вайне з СССР, немагчымасць вяртання на Радзіму. Вядома, што на тэрыторыі Германіі існавалі спецыяльныя лагеры, дзе дзяцей з акупіраваных тэрыторый прымушалі цяжка працаваць, забываць радзіму і мову, праводзілі над імі медыцынскія эксперыменты.

Помнік-мемарыял такім дзецям узведзены на Гомельшчыне, дзе на тэрыторыі гаспадаркі “Чырвоны бераг” немцы стварылі пункт збору дзяцей для адпраўкі ў Германію і для забора крыві. Мемарыял адкрывае скульптура адзінокай дзяўчынкі, на твары якой боль і бездапаможнасць. Паднятымі над галавой рукамі яна як бы абараняецца ад усіх жахаў вайны (архітэктар Л. Левін). Гэта ўражвае і не забываецца.

Для правядзення прагерманскай маладзёжнай палітыкі ў чэрвені 1943 г. з нявопытнай і даверлівай моладзі акупацыйныя ўлады стварылі калабаранцкую арганізацыю – Саюз беларускай моладзі (СБМ). Мэтай яе аб’яўлялася фарміраванне будучай беларускай эліты. На самай справе арганізацыя гэта павінна была адцягнуць увагу моладзі ад удзелу ў партызанскім руху і патрыятычным падполлі. Разам з тым, яна з’яўлялася цэнтрам мабілізацыі і адпраўкі юнакоў і дзяўчат на працу ў Германію. У СБМ прымалася беларуская моладзь ад 10 да 20 гадоў. Яе структурнае будаўніцтва капіравалася з арганізацыйных формаў гітлерюгенда. Арганізацыя мела нават свой друкаваны орган – часопіс “Жыве Беларусь”. Яе члены насілі спецыяльную форму і атрымлівалі дадатковы паёк. Апошняя акалічнасць ва ўмовах ваеннага часу была істотным матывам для ўступлення ў яе рады. Але масавай яна не стала. Колькасць членаў Саюза беларускай молодзі ацэньваецца гісторыкамі ў 12,5 тыс. чалавек. Досыць часта членства ў саюзе з’яўлялася прыкрыццём іх нелегальнай барацьбы [9].

Шматлікія крыніцы сведчаць, што, нягледзячы на складанасць абстаноўкі, беларуская моладзь мела патрыятычны настрой. Юнакі і дзяўчаты з першых дзён вайны ўключыліся ў антыфашысцкую барацьбу з агрэсарам, сталі актыўнымі ўдзельнікамі масавага руху супраціўлення на акупіраванай тэрыторыі. Як вядома, у шэрагах змагароў супраць акупантаў налічвалася больш за 440 тыс. беларускіх партызан і падпольшчыкаў. Сярод іх 12,8 % складала моладзь да 20 гадоў, у тым ліку больш за 5 тыс. дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў [4, с. 14]. Дзеці былі разведчыкамі і сувязнымі, распаўсюджвалі лістоўкі і савецкую літаратуру, збіралі для партызан зброю і боепрыпасы, удзельнічалі у баявых аперацыях. У іх не было асабістых дакументаў і ім было лягчэй перамяшчацца па тэрыторыі, не выклікаючы падазронасці ў немцаў і паліцэйскіх. Досыць часта дзеці-разведчыкі стваралі вобраз падлетка-жабрака, які нібы думаў толькі пра ўласнае выжыванне. Разам з тым, яны забяспечвалі партызанскія атрады звесткамі аб варожых эшалонах, аб падыходах да аб’ектаў ворага і г.д.

Значэнне такой дапамогі цяжка перааацаніць. Дзякуючы гэтаму, партызаны засцерагаліся ад раптоўных нападаў ворага, мелі магчымасць падрыхтавацца да адпору у час карных аперацый, зберагчы людзей. Як сувязныя, дзеці падтрымлівалі кантакты

партызан з мясцовым насельніцтвам, дапамагалі забяспечваць іх харчаваннем, адзеннем, медыкаментамі, ратавалі параненых.

Добра вядомы на Беларусі імёны такіх дзяцей-герояў, як Марат Казей, Зінаіда Партнова, Мікалай Гойшык і іншых, якія за свае гераічныя ўчынкі былі ўдастоены высокіх званняў і ўзнагарод. Але вельмі шмат менш вядомых, але не менш значных імёнаў дзяцей, якія праяўлялі недзіцячую мужнасць і гераізм у барацьбе з ворагам.

Так, смела вяла разведку ў месцах размяшчэння праціўніка юная партызанка другой Беларускай брыгады імя П.К. Панамарэнкі Надзя Багданава. Яна вызначыла размяшчэнне варожага штаба, прыкладную колькасць варожага гарнізона, куляметных кропак, замаскіраванных пушак і асабіста суправаджала партызан на баявыя аперацыі. У ноч з 11 на 12 лютага 1943 г. Надзя правяла групу партызан на чале з камандзірам М.І. Яўсеевым да будынка варожага штаба. Партызаны знялі ахрану, закідалі штаб гранатамі, знішчылі большую частку афіцэраў. З такім жа поспехам смелая і кемлівая разведчыца выконвала і іншыя заданні камандавання, праяўляла пры гэтым мужнасць і адвагу [7, с. 259].

Адважнай партызанскай сувязной зарэкамендавала сябе пятнаццацігадовая Клара Філіпава, якая дзейнічала ў г. Гомелі. На працягу некалькіх дзён яна збірала звесткі аб перамяшчэнні жывой сілы і тэхнікі праціўніка на шашы Рэчыца-Гомель і тым самым істотна дапамагла партызанам знішчыць ворага [7, с. 257]. І такіх прыкладаў вельмі шмат. Усяго на момант злучэння з Чырвонай арміяй у партызанскіх атрадах налічвалася 8,87% ці 2500 падлеткаў, якія не дасягнулі прызыўнога ўзросту. Немцы называлі іх “banden kinder”. Масавы ўдзел дзяцей у антыфашысцкай барацьбе прымусіў немцаў у 1943 г. прыняць нават спецыяльны загад “Об обращении с бандитскими детьми” [4, с. 32].

За ўклад дзяцей у Перамогу 37 тыс. юнакоў і дзяўчат былі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі [10, с. 64].

Навуковыя даследванні тлумачаць удзел дзяцей у масавым руху супраціўлення на акупіраванай тэрыторыі рознымі фактарамі. Гэта жорсткая палітыка акупантаў, якія чынілі гвалт над мірным насельніцтвам, страта блізкіх людзей, прыклад дарослых, якія ўключыліся ў барацьбу з першых дзён вайны. Але больш за ўсё падкрэсліваецца роля савецкай даваеннай сістэмы выхавання ў піянерскіх і камсамольскіх арганізацыях, дзе дзейнічаў лозунг:

піянер і камсамолец павінны быць “заўседы гатовы да абароны сваёй Радзімы”.

Памяць аб тых гераічных і трагічных старонках нашай гісторыі свята захоўваецца на нашай зямлі. Яна ў сэрцах тых, хто быў непасрэдным удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і якіх з кожным годам становіцца ўсё менш. Яна ў шматлікіх помніках і абелісках, якія паўсталі за пасляваенны перыяд, яна ў лепшым у Еўропе музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у выкладанні спецкурса “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны”, які ўведзены ў ВНУ Беларусі. Акрамя таго, у БНТУ кафедра “Гісторыя, сусветная і айчынная культура” штогод праводзіць агульнаўніверсітэцкія і факультэцкія канферэнцыі па ваеннай тэматыцы, арганізуе экскурсіі ў музей, сустрэчы з ветэранамі, паходы па месцах баявой славы, выдаюцца зборнікі студэнцкіх работ, у якіх моладзь усё часцей звяртаецца да праблемы вайны ў лёсе іх сям'яў. Выхаванне гісторыяй – галоўная састаўляючая ўсей выхаваўчай работы, гарантыя таго, каб жахі вайны ніколі не паўтарыліся.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941-1944). – Мінск, 1995 – 440 с.

2. Паўлаў, У.П. Дзеці ліхалецця. Дакументальныя нарысы / У.П. Паўлаў. – Мінск: ААП “Паліграфкамбінат імя Я.Коласа, 2005. – 416 с.

3. Дети войны. Материалы круглого стола. Детские дома в г. Витебске и Витебской области на временно оккупированной территории в годы Великой Отечественной войны 1941-1944. – Витебск: 2007 – 144 с.

4. Бездзель, В.Я. Дзеці на акупаваннай тэрыторыі Беларусі. Манаграфія. / В.Я. Бездзель. – Віцебск, 2013. – 157 с.

5. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. – Минск: Гос. издательство БССР, 1963.

6. Гребенкина, А.А. Живая боль: женщины и дети Брестского гарнизона (1941-1944). / А.А. Гребенкина. – Мінск, 2008. – 170 с.

7. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков. В 3 т. – Минск: издательство “Беларусь”. – Т. 2 – Минск, 1984 – 550 с.

8. Трагедия евреев Белоруссии (1941-1944 гг.). Сборник материалов и документов. – Минск, 1997. – 398 с.

9. Каваленя, А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941-1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. / А.А. Каваленя. – Мінск, БДПУ імя М. Танка, 1999 – 260 с.

10. Котаў, А.I. Дзеці Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. / А.I. Котаў // 55 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Матэрыялы навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, 5 мая 2000 г. – Мінск. – С. 62-64.

## ИСТОРИЯ РЕМЕСЛЕННЫХ ЦЕХОВ МИНСКА В XVI–XIX вв.

Семёнова Л.Н.,
доктор исторических наук, профессор

Цехи стали самой распространенной формой организации городского ремесла. В Западной Европе они получили развитие в XII – XV вв. Не без влияния Магдебургского права, пришедшего из Германии, а в большей степени по причине географического соседства примеры именно немецкого цехового устройства и некоторые названия переходили к белорусским цехам. Даже само понятие «цех» пришло от немецкого zeche, zeichen, zünfte, что означает и знак, и стяг, и цех.

С XVI в. появляются первые документальные свидетельства о ремесленных цехах г. Минска. Безусловно, ремесленники и раньше играли существенную роль в экономике города и составляли значительную часть его мещанства – городского сословия. Но именно в XVI в. с началом структурирования европейской капиталистической экономики в аграрных странах появилась необходимость государственной организации крестьянского и ремесленного труда. Крестьян прикрепили к земле с помощью крепостного права, ремесленникам предписали объединиться в цеховую организацию. Как писал Ф. Бродель, в Польше, в Венгрии, в Чехии «вторичное закрепощение» действительно возникло к выгоде сеньоров и магнатов, которые с того времени стали между крестьянином и рынком и господствовали даже над снабжением городов в тех случаях, когда